Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Рэктар БДУКМ
___________ Ю. П. Бондар
«____» _____________ 2015 г.
Рэгістрацыйны № ВД-___ /баз.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЭТНАМУЗЫКАЛОГІЯ

*Вучэбная праграма*
*ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне*
*для спецыяльнасці 1-18 01 01 Народная творчасць*
*(па напрамках), напрамку спецыяльнасці*
*1-18 01 01-05 Народная творчасць (фальклор)*

Мінск
БДУКМ
2015

**СКЛАДАЛЬНІКІ:**
*Э. В. Шчадрына*, выкладчык кафедры этналогіі і фальклору ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»;
*В. В. Калацэй*, загадчык кафедры этналогіі і фальклору ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат культуралогіі, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**
*Т. Б. Варфаламеева*, старшы навуковы супрацоўнік дзяржаўнай навуковай установы «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі», кандыдат мастацтвазнаўства;
*Л. Л. Ражкова*, загадчык кафедры беларускай народнапесеннай творчасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**
*кафедрай* этналогіі і фальклору ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 7 ад 13.03.2014 г.);
*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 5 ад 18.06.2014 г.)

Адказны за рэдакцыю: В. Б. Куласевіч
Адказныя за выпуск: Э. В. Шчадрына, В. В. Калацэй

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Дысцыпліна «Этнамузыкалогія» складаецца з трох раздзелаў: «Беларуская этнамузыкалогія», «Методыка экспедыцыйных этнамузыкалагічных даследаванняў», «Этнамузыкалагічны практыкум». Яна тэарэтыка-метадалагічна абагульняе веды, атрыманыя студэнтамі ў працэсе засваення сумежных дысцыплін «Этнафанічны практыкум», «Этнамузыкалогія», і ўзбагачае магчымасці і якасць практычнай дзейнасці будучых фалькларыстаў-практыкаў у галіне апрацоўкі фальклорна-этнаграфічных матэрыялаў.

*Мэта дысцыпліны* «Этнамузыкалогія» – фарміраванне сістэмы ведаў студэнтаў аб тэарэтычных асновах, навуковых напрамках і метадах вывучэння народнай традыцыйнай музычнай культуры, якія дазваляюць раскрыць сістэму абумоўленасці, сувязі з'яў музычнага фальклору з кантэкстам і формамі культурнай традыцыі.

*Задачы дысцыпліны:*

– выяўленне спецыфікі этнамузыкалогіі як навукі, інтэгруючай розныя аспекты вывучэння музычнага фальклору ў кантэксце традыцый народнай культуры;

– асвятленне асноўных тэарэтычных канцэпцый у гістарычнай дынаміцы іх станаўлення і развіцця;

– асваенне выпрацаваных у айчыннай і замежнай навуцы метадаў даследавання народнай музыкі.

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнты павінны *ведаць*:

– асноўныя кірункі, школы, метады і тэндэнцыі развіцця айчыннай і замежнай этнамузыкалогіі, асноўныя тэарэтычныя працы і публікацыі музычна-этнаграфічных матэрыялаў;

– асноўныя даследчыя праблемы ў галіне народнай традыцыйнай музычнай культуры: прыроду, мову, змест, форму, прызначэнне, функцыі музычнага фальклору ў кантэксце культурнай традыцыі;

– месца музычнага кампанента ў структуры фальклорна-этнаграфічнага матэрыялу;

– метады вывучэння народнай музыкі;

– метады ўключэння народнай музыкі ў розныя формы адукацыйнай і канцэртна-асветніцкай дзейнасці.

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнты павінны *ўмець*:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– вызначаць асноўныя дыялектныя прыкметы народнай музычнай традыцыі (на лакальным ці рэгіянальным узроўнях);

– рабіць комплексны аналіз сродкаў мастацкай выразнасці фальклорна-этнаграфічнага матэрыялу;

– сістэматызаваць узоры народнай музыкі;

– карыстацца навуковай і даведачнай літаратурай па пытаннях дысцыпліны.

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнты павінны *валодаць*:

– методыкамі каталагізацыі народных песень і найгрышаў;

– методыкамі вызначэння кампазіцыйна-рытмічных заканамернасцей розных жанраў фальклору.

*Метады* навучання ў рамках дадзенай дысцыпліны адпавядаюць агульным патрабаванням да фарміравання прафесійных кампетэнцый студэнта. Метадычнымі асновамі дысцыпліны з’яўляюцца: тлумачальна-ілюстратыўныя, рэпрадукцыйныя метады (апавяданне, тлумачэнне, гутарка, дыскусія, лекцыя, дэманстрацыя кіна- і аўдыязапісаў, палявых відэазапісаў аўтэнтычных абрадаў, метад слыхавога пераймання ў працэсе актуалізацыі фальклорнай спадчыны), праблемныя (творчы дыялог, вопыт, назіранне, эксперымент), метады самастойнай работы студэнтаў (работа з першакрыніцамі, расшыфроўка паэтычных тэкстаў аўдыя- і відэаматэрыялаў), кантрольна-ацэначныя метады (адказы на семінарах, практыкаванні).

На вывучэнне дысцыпліны «Этнамузыкалогія» ўсяго адведзена 632 гадзіны, з іх 320 гадзін – аўдыторныя заняткі (100 гадзін – лекцыі, 200 гадзін – практычныя, 20 гадзін – семінары).

Рэкамендаваныя формы кантролю ведаў студэнтаў – залік і экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Раздзелы і тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | |
|---|---|---|---|
| | усяго | лекцыі | практ. і сем. зан. |
| **Уводзіны** | 2 | 2 | |
| **Раздзел I. Беларуская этнамузыкалогія** | | | |
| *Тэма 1.* Асноўныя тэрміны і паняцці этнамузыкалогіі | 6 | 2 | 4 |
| *Тэма 2.* Музычная мова і іншыя «мовы» традыцыйнай культуры | 10 | 4 | 6 |
| *Тэма 3.* Спецыфіка музычнага фальклору | 6 | 2 | 4 |
| *Тэма 4.* Станаўленне беларускай этнамузыкалогіі як навукі, этапы развіцця | 6 | 2 | 4 |
| *Тэма 5.* Працы польскіх і чэшскіх збіральнікаў і даследчыкаў беларускага музычнага фальклору | 6 | 2 | 4 |
| *Тэма 6.* Беларуская этнамузыкалогія і пецярбургская школа акадэміка Асаф'ева | 8 | 4 | 4 |
| *Тэма 7.* Я. Гіпіус і яго значэнне для беларускай этнамузыкалогіі | 6 | 2 | 4 |
| *Тэма 8.* Беларускае адраджэнне пачатку XX ст. і народная музыка | 6 | 2 | 4 |
| *Тэма 9.* Р. Шырма – збіральнік беларускага музычнага фальклору | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 10.* Дзейнасць Г.Цітовіча | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 11.* Праца Я.Гіпіуса «Праблема музычнага фальклору» | 8 | 4 | 4 |
| *Тэма 12.* Этнамузыкалагічныя даследаванні ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі | 6 | 4 | 2 |
| *Тэма 13.* Этнамузыкалагічныя даследаванні ў НАН Беларусі 1960–90 гг. | 6 | 2 | 4 |
| *Тэма 14.* Беларускае этнаінструментазнаўства | 6 | 2 | 4 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Раздзел ІІ. Метадыка экспедыцыйных этнамузыкалагічных даследаванняў** | | | |
| *Тэма 15.* Метады структурнага аналізу народнай музыкі | 14 | 4 | 10 |
| *Тэма 16.* Метады стылявога аналізу народнай музыкі | 14 | 2 | 12 |
| *Тэма 17.* Параўнальныя метады вывучэння народнай музыкі | 18 | 2 | 16 |
| *Тэма 18.* Функцыянальны метад і яго прымяненне ў этнамузыкалогіі | 12 | 2 | 10 |
| *Тэма 19.* Арэальны метад вывучэння традыцый вуснай музычнай культуры | 16 | 4 | 12 |
| *Тэма 20.* Метады сістэматызацыі і класіфікацыі музычнага фальклору | 12 | 2 | 10 |
| *Тэма 21.* Удасканаленне факталагічнай базы навукі, эксперыментальныя метады ў этнамузыкалогіі | 18 | 4 | 14 |
| *Тэма 22.* Адукацыйны, выхаваўчы, сацыякультурны аспекты этнамузыкалогіі | 18 | 4 | 14 |
| **Раздзел ІІІ. Этнамузыкалагічны практыкум** | | | |
| *Тэма 23.* Асновы натацыі народных песень: Спецыфіка фальклорных выканальніцкіх прыёмаў і спосабы іх абазначэння | 12 | 4 | 8 |
| *Тэма 24.* Асноўныя рытмічныя малюнкі народнай песні | 12 | 4 | 8 |
| *Тэма 25.* Вызначэнне тэмпу ў народных песнях. Лад і танальнасць народнай песні | 10 | 4 | 6 |
| *Тэма 26.* Вызначэнне музычнай формы народнай песні | 10 | 4 | 6 |
| *Тэма 27.* Упрыгожванні ў народных песнях. Мелізмы | 12 | 4 | 8 |
| *Тэма 28.* Народнапесенны верш. Музычная страфа. Афармленне натацыі | 12 | 4 | 8 |
| *Тэма 29.* Асновы літаратурнага аналізу народных песень: Народнапесенная паэзія. Чысты верш | 12 | 4 | 8 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | |
|---|---|---|---|
| *Тэма 30.* Тыпы фальклорнага верша. Сюжэт і кампазіцыя верша. Родавыя і жанравыя разнавіднасці народнапесеннага верша | 10 | 4 | 6 |
| *Тэма 31.* Музычная страфа і куплет. Рытмаскладовая формула верша | 8 | 2 | 6 |
| *Тэма 32.* Асаблівасці дыялекту народных песень | 10 | 4 | 6 |
| **Разам …** | **320** | **100** | **220** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## *Уводзіны*

Прадмет і задачы дысцыпліны «Этнамузыкалогія». Музычны фальклор (этнічная музыка вуснай традыцыі) як частка нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі. Неабходнасць яго вывучэння і захавання.

## Раздзел І. Беларуская этнамузыкалогія

### *Тэма 1. Асноўныя тэрміны і паняцці этнамузыкалогіі*

Этнамузыкалогія – навука, якая існуе «на перакрыжаванні» музыказнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі, вывучае этнічныя, гістарычна характэрныя праявы музычнай творчасці народаў. Тлумачэнне найважнейшых тэрмінаў і паняццяў этнамузыкалогіі, якія раскрываюць яе як полідысцыплінарную навуку. Сэнсавыя сувязі паміж этнамузыкалагічнымі тэрмінамі.

### *Тэма 2. Музычная мова і іншыя «мовы» традыцыйнай культуры*

Неабходнасць і спецыфіка перадачы ведаў ва ўмовах культуры вуснага тыпу. Сімвалічныя «мовы» народнай культуры, якія адрозніваюцца паміж сабой сродкамі перадачы інфармацыі, але маюць адзінае «поле» значэнняў. Рытуал і яго коды. Гукавы код народнай культуры. Функцыі гуку і голасу ў традыцыйнай культуры.

### *Тэма 3. Спецыфіка музычнага фальклору*

Вуснасць, варыятыўнасць, калектыўнасць, полістадыяльнасць як фундаментальныя ўласцівасці музычнага фальклору. Музычна-фальклорная традыцыя (у т.л. лакальная). Культурны тэкст. Тэкст і кантэкст у музычным фальклоры.

### *Тэма 4. Станаўленне беларускай этнамузыкалогіі як навукі, этапы развіцця*

Рамантычны этап (першыя 2/3 XIX ст.) як «перыяд накаплення навуковых сіл і матэрыялу». Недасканалая сістэмнасць і пэўная тэндэнцыйнасць публікацый. Прафесійны этап (апошняя 1/3 XIX ст. – 1917 г.). Паўночна-заходні аддзел Расійскага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

геаграфічнага таварыства. Сістэмны дослед фальклору і «незалежныя» этнографы. Інтарэс грамадскасці да фальклору праз дзейнасць асветнікаў і публіцыстаў. Даваенны этап (1917 г. – 1940-я гг.) і яго супярэчлівасць: дзяржаўная падтрымка народазнаўства, але адначасова і – моцны кантроль. Палітыка беларусізацыі. Інстытут беларускай культуры, АН БССР. Арыентацыя на фундаментальную навуку. Дзейнасць А. Грыневіча і М. Гарэцкага, кампазітараў М. Чуркіна, А. Туранкова, М. Аладава. Даследаванні Я. Гіпіуса і З. Эвальд, пачатак дзейнасці Р. Шырмы і Г. Цітовіча. Страты, нанесеныя музыкалогіі рэпрэсіямі 1930-х гг. і Другой сусветнай вайной. Пасляваенны этап: станаўленне беларускай этнамузыкалогіі (1950-я гг. – канец ХХ ст.). Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР. Дзейнасць Л. Мухарынскай, Л. Касцюкавец, Т. Якіменка, З. Мажэйкі, В. Ялатава. Сістэматызаваныя выданні і фальклорныя зборы.

### *Тэма 5. Працы польскіх і чэшскіх збіральнікаў і даследчыкаў беларускага музычнага фальклору*

Варшаўскае таварыства сяброў навук (1800 г.) і яго сумесная з Віленскім універсітэтам праграма па вывучэнні помнікаў гісторыі і культуры беларусаў як рэакцыя на заняпад Рэчы Паспалітай. Беларускі музычны фальклор у польскіх выданнях XIX – пачатку XX ст. Перыядычныя выданні Варшавы і Вільні пра фальклор беларусаў. Сістэматычныя даследаванні Антрапалагічнай камісіі Польскай акадэміі навук (Кракаў). Дзейнасць М. Федароўскага (1853–1923) па падрыхтоўцы і выданні збору «Люд беларускі». Музычныя фальклорныя зборы польскага этнографа О. Кольберга, чэшскага этнамузыколага Л. Кубы.

### *Тэма 6. Беларуская этнамузыкалогія і пецярбургская школа акадэміка Асаф’ева*

Савецкае народазнаўства і мастацтвазнаўства 1930-х гг. Этнамузыкалогія як навука на мяжы мастацтвазнаўства, псіхалогіі і гістарычнай сацыялогіі. Інтанацыйная тэорыя Б. Асаф’ева (1884–1949) як аснова даследаванняў навукоўцаў пецярбургскай этнамузыкалагічнай школы. Разуменне фальклору (музыкі вуснай традыцыі) як творчага метаду, які адлюстроўвае тып культуры і жывую музычную мову («інтанацыйны слоўнік»)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

эпохі і народа. Доўгачасовая праграма Б. Асаф’ева па збіранні, даследаванні, вучэбнай і выдавецкай дзейнасці ў галіне музычнага фальклору. Непасрэдныя вучні Асаф’ева Я. Гіпіус і З. Эвальд і іх даследаванні фальклору беларусаў.

*Тэма 7. Я. Гіпіус і яго значэнне*
*для беларускай этнамузыкалогіі*

Я. Гіпіус (1903–1985) – фальклараст і даследчык народнай творчасці. Фанаграмархіў Інстытута антрапалогіі, этнаграфіі і археалогіі АН СССР, заснаваны Я.Гіпіусам як цэнтр вядучых этнамузыколагаў краіны. Экспедыцыі па гомельскім Палессі і Падняпроўі, наладжаныя ў 1930-я гг. Я. Гіпіусам, З. Эвальд сумесна з М. Грынблатам (секцыя этнаграфіі і фальклору АН БССР) і пецярбургскім фальклырыстам Ф.Рубцовым. Дзейнасць гэтых даследчыкаў як перадумова фарміравання этнамузыкалогіі як адной з цэнтральных дысцыплін беларускай народазнаўчай навукі. Падрыхтоўка і выданне збораў «Песні беларускага народа» і «Белорусские народные песни» як сістэматызаванага адлюстравання даваеннай песеннай сістэмы Беларусі.

*Тэма 8. Беларускае адраджэнне пачатку XX ст.*
*і народная музыка*

Інтарэс беларускай грамадскасці да фальклору праз дзейнасць асветнікаў і публіцыстаў пачатку XX ст. Дзяржаўная падтрымка народазнаўства ў савецкі час, але і – моцны кантроль за ідэалогіяй. Палітыка беларусізацыі. Інстытут беларускай культуры, АН БССР. Арыентацыя на фундаментальную навуку і «адвакацкая функцыя» этнамузыколагаў па абароне фальклору і яго носьбітаў. Дзейнасць па збіранні і папулярызацыі фальклору этнамузыколага А. Грыневіча (1877–1937) і фальклырыста М. Гарэцкага (1893–1938), кампазітараў М. Чуркіна, А. Туранкова, М. Аладава.

*Тэма 9. Р. Шырма – збіральнік беларускага*
*музычнага фальклору*

Р. Шырма (1892–1978) – асветнік, фальклырыст, музыка. Даследча-збіральніцкая праца ў Заходняй Беларусі. Віленскі перыяд дзейнасці Шырмы. Праца па стварэнні прэцэдэнтаў харавога руху ў Беларусі. Неабгрунтаваныя рэпрэсіі і рэабі-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

літацыя ў ваенны перыяд, канцэртная практыка на фронце. Гродзенскі перыяд дзейнасці як унёсак у фарміраванне нацыянальнай харавой адукацыі. Перыяд прызнання і актыўнай канцэртнай дзейнасці капэлы Шырмы ў 1950–1970-я гг. Чатырохтомнае выданне беларускіх песень як вынік шматгадовай даследчай і збіральніцкай дзейнасці.

*Тэма 10. Дзейнасць Г. Цітовіча*

Г. Цітовіч (1910–1982) – асветнік, фальклярыст, музыка. Удзел у хоры Шырмы ў Вільні, прафесійныя заняткі музыкай і фальклярыстыкай у Заходняй Беларусі і прылеглых раёнах Польшчы. Праца з вясковымі спеўнымі гуртамі Палесся і стварэнне Дзяржаўнага народнага хору ў Мінску (1952). Даследчая і выдавецкая дзейнасць па прапагандзе каранёвай музыкі беларусаў ва ўрбаністычным асяроддзі. «Анталогія беларускай народнай песні» як фундаментальнае канцэптуальнае аўтарскае выданне. Жыццёвы шлях Цітовіча як прыклад станаўлення практычнай этнамузыкалогіі.

*Тэма 11. Праца Я. Гіпіуса «Праблема музычнага фальклору»*

Параўнаўчае музыказнаўства як дысцыпліна, якая вывучае жывую музыку беспісьменнай традыцыі. Навязванне параўнаўчаму музыказнаўству метадаў даследавання прафесійнага музыказнаўства. Дыскусія з Э. Наўманам па пытаннях якаснай спецыфікі фальклору. Фальклор як дыялектычная еднасць функцый грамадскай праявы творчасці – функцый вытворчасці і спажывання. Вытворчасць–спажыванне фальклору ў розных сацыяльных слаях грамадства.

*Тэма 12. Этнамузыкалагічныя даследаванні ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі*

Дзейнасць этнамузыколагаў Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі як даследчыкаў, педагогаў, публіцыстаў, прапагандыстаў і палевікоў-практыкаў. Кабінет народнай музыкі, кафедра беларускай музыкі (1990). Тэматыка даследчых работ спецыялістаў-этнамузыколагаў БДАМ як адлюстраванне маштабнасці жыцця песенных форм фальклору Беларусі. Даследаванні выхаваных Л. Мухарынскай этнамузыколагаў Л. Касцюкавец і Т. Якіменка па кантавай культуры Беларусі, беларускіх песнях-баладах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Л. Мухарынская (1906–1987) – заснавальнік традыцый этнамузыкалагічных даследаванняў у Белдзяржкансерваторыі (Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі). Даследаванні па ладавай аснове народнай песні, пераемнасці ў развіцці музычнага фальклору. Выхад на даследаванне кардынальных асноў і законаў жыцця фальклору як падмурак уключэння этнамузыкалогіі ў кола фундаментальнага беларускага народазнаўства. Штогадовыя навуковыя чытанні памяці Л. Мухарынскай (з 1991 г.) як форум усходнееўрапейскіх этнамузыколагаў.

### *Тэма 13. Этнамузыкалагічныя даследаванні ў НАН Беларусі 1960–90 гг.*

Заснаванне ІМЭФ НАН Беларусі (1957) як сродак сістэматызацыі і канцэптуалізацыі збіральніцкай і навукова-даследчай работы з музычным фальклорам. Даследаванне ладавай і рытмічнай асновы беларускага фальклору В. Ялатавым (1923–1980), сістэмна-тыпалагічнай арганізацыі песнятворчасці З. Мажэйкі, рэгіянальных асаблівасцей фальклору Т. Варфаламеевай і Г. Таўлай. Фальклорныя зборы «Беларуская народная творчасць» (гал. рэд. А. Фядосік), «Песні рэгіёнаў» як сістэмная прэзентацыя музычнага фальклору ў відава-жанравай і рэгіянальнай перспектывах на падмурку мэтанакіраванага суцэльнага даследавання этнакультурных рэгіёнаў. Дзейнасць этнамузыколагаў у галіне практычнай фальклрыстыкі (этнаграфічныя канцэрты і антрапалагічныя фільмы З. Мажэйкі, фестывалі фальклору).

### *Тэма 14. Беларускае этнаінструментазнаўства*

Этнаінструментазнаўчы кірунак беларускай этнамузыкалогіі, які развівае з 1970-х гг. І. Назіна. Даследаванні жанравага складу, асаблівасцей функцыянавання, стылявых рыс музычнаінструментальнага фальклору. Характарыстыка сігнальных найгрышаў, гукавыяўленчых найгрышаў, песенных найгрышаў, танцавальных найгрышаў, маршаў, прапанаваная І. Назінай. Яе выданні па беларускіх народных інструментах. Калекцыя народных інструментаў, відэастужкі аб музыках і народных інструментах. Зварот да кагнітыўнага падыходу да інструментальнай традыцыйнай музыкі як працяг даследчага кірунку, закладзенага М. Нікіфароўскім у творы «Дудар і Музыка». Праблема рэвіталізацыі каранёвых музычных інструментаў (дуды, колавай ліры, парных дудак) у XX ст.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел II. Методыка экспедыцыйных этнамузыкалагічных даследаванняў

*Тэма 15. Метады структурнага аналізу народнай музыкі*

Вядучыя палажэнні сучаснай навукі аб відах і формах народнай традыцыйнай культуры. Комплексны аналіз сродкаў мастацкай выразнасці фальклорна-этнаграфічнага тэксту. Формы ўзаемадзеяння структурных элементаў фальклорнага матэрыялу ў натуральных умовах яго аднаўлення (арганізацыя экспедыцыйнага запісу, поўная пашпартызацыя, атрыбуцыя кожнага структурнага элемента ў сувязі з абставінамі выканання, прызначэннем). Месца музычнага кампанента ў структуры фальклорна-этнаграфічнага тэксту, непарыўная сувязь музыкі, слова, дзеяння. Рытмічная арганізацыя і яе рознаўзроўневыя праявы. Узаемасувязь кампазіцыі і рытму ў арганізацыі музычнага працэсу. Кампазіцыйна-рытмічныя заканамернасці розных жанраў фальклору. Прынцыпы выяўлення меладычнай і ладавай структуры ў розных жанрах музычнага фальклору. Ладагарманічная структура як асаблівая форма арганізацыі музычнай тканіны; яе жанравае, дыялектнастылявое значэнне.

Метады структурнага аналізу і прынцыпы каталагізацыі народных песень і найгрышаў, распрацаваныя рознымі даследчыкамі (Ф. Калеса, Я. Гіпіус, А. Руднева, Б. Яфіменкаваі інш.).

*Тэма 16. Метады стылявога аналізу народнай музыкі*

Паняцце «музычны стыль» і асаблівасці яго прымянення ў этнамузыкалогіі. Задачы і метады стылявога вывучэння прафесійнай і народнай музыкі (працы М. Міхайлава, Я. Руч’еўскай, Ф. Рубцова, А. Мехняцова). Жанрава-дыялектныя, гісторыкастылявыя асаблівасці народнай музыкі. А. Руднева, В. Шчураў аб стылявой адметнасці народных песень. Стылявыя аспекты вывучэння кампазіцыйна-рытмічных заканамернасцей на прыкладзе розных жанраў музычнага фальклору. Інтанацыйная тэорыя Б. Асаф’ева і яе прымяненне ў дачыненні да народнай песеннай культуры. Працы Ф. Рубцова. Вывучэнне ўзаемасувязей песенных і непесенных форм інтанавання. Функцыянальна-семантычны аналіз ладаінтанацыйнага і інтанацыйнарытмічнага ўзораў арганізацыі песеннай гаворкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Значэнне выканальніцкіх асаблівасцей (тэсітура, тэмбр, тэмп, дыханне, асобныя пеўчыя прыёмы) у сістэме сродкаў мастацкай выразнасці; выканальніцкі стыль як адзін з важных формаўтваральных і сэнсавых бакоў фальклорнага «тэксту». Работы З. Эвальд, З. Мажэйкі і іншых даследчыкаў.

*Тэма 17. Параўнальныя метады вывучэння народнай музыкі*

Развіццё параўнальных метадаў вывучэння народнай музыкі. Спецыфіка прымянення параўнальнага метаду вывучэння вуснай музычнай культуры. Фарміраванне тыпалагічнага падыходу да з'яў народнай музыкі.

Суадносіны паняццяў «тып» і «варыянт». Параўнальна-аналітычны (структурна-тыпалагічны) метад і яго прымяненне на пачатковым этапе сістэматызацыі матэрыялу. Параўнальна-гістарычны (гісторыка-тыпалагічны) метад у фалькларыстыцы і этнамузыкалогіі, яго значэнне ў выяўленні гістарычных пластоў народнай музычнай культуры. Канцэпцыі ўзнікнення і гістарычнай эвалюцыі ладоў структур у народнай музыцы і іх крытычная ацэнка ў святле сучасных даследаванняў.

*Тэма 18. Функцыянальны метад і яго прымяненне ў этнамузыкалогіі*

Комплекснае вывучэнне з'яў народнай традыцыйнай культуры. Камунікатыўная прырода народнай музыкі. Поліфункцыянальнасць фальклору. Роля народнай музыкі ў жыцці чалавека, у яго духоўным і творчым развіцці. Суадносіны паняццяў «роля», «прызначэнне», «функцыя»; іх дачыненне да змястоўнай, структурнай, стылявой характарыстыкі мастацкай формы ў фалькларыстыцы і этнамузыкалогіі.

*Тэма 19. Арэальны метад вывучэння традыцый вуснай музычнай культуры*

Вызначэнне асноўных дыялектных прыкмет народнай музычнай традыцыі (на лакальным ці рэгіянальным узроўнях). Картаграфаванне значных прыкмет народнай музычнай традыцыі. Выяўленне арэалаў распаўсюджвання песенных тыпаў і іншых з'яў народнай песеннай і інструментальнай традыцыі. Вызначэнне меж распаўсюджвання лакальных і рэгіянальных песенных традыцый на тэрыторыі Беларусі і ў еўрапейскіх краінах. Праграма распрацоўкі фальклорна-этнаграфічнага атласа.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 20. Метады сістэматызацыі*
*і класіфікацыі музычнага фальклору*

Спецыфіка родаў, відаў, жанраў фальклору. Вызначэнне вядучых класіфікацыйных прыкмет кожнай групы з'яў музычнага фальклору. Праблема ўзгаднення прынцыпаў жанравай класіфікацыі, якія выкарыстоўваюцца ў этнамузыкалогіі. Метады сістэматызацыі ўзораў народнай музыкі: лексікаграфічны, «граматычны» (Б. Барток); класіфікацыя на аснове комплекснага аналізу (А. і А. Эльшаковы); таксанамічны прынцып групоўкі фальклорных матэрыялаў (А.Чэканоўска). Праблема стварэння адзінай інфармацыйнай сістэмы, якая ўключае звесткі аб традыцыйнай музычнай культуры і фальклоры розных народаў свету. Прынцыпы сістэматызацыі ўзораў музычнага фальклору. Класіфікацыя народных інструментаў і форм народнай інструментальнай музыкі.

*Тэма 21. Удасканаленне факталагічнай базы навукі,*
*эксперыментальныя метады ў этнамузыкалогіі*

Асноватворнае значэнне палявых даследаванняў у развіцці этнамузыкалогіі. Сучасныя метады палявых даследаванняў. Задачы комплексных экспедыцый. Удасканаленне тэхналогій гука-, відэазапісу, расшыфроўкі і натацыі музычнага фальклору (работы Я. Гіпіуса, Э. Аляксеева і інш.). Натацыі і выданні запісаў. Выканальніцкая практыка як форма навуковага эксперымента: авалодванне спеўнай традыцыяй як адзін са спосабаў спасціжэння законаў арганізацыі песеннай гаворкі.

*Тэма 22. Адукацыйны, выхаваўчы, сацыякультурны аспекты*
*этнамузыкалогіі*

Грамадскае прызнанне неабходнасці захавання традыцый народнай музычнай культуры як аднаго з найважнейшых кампанентаў культурнай спадчыны. Развіццё метадаў уключэння народнай музыкі ў розныя формы адукацыйнай і канцэртна-асветніцкай дзейнасці. Спецыфіка народнай музыкі вуснай традыцыі і аранжыроўкі напеваў. Зварот прафесійных і аматарскіх творчых калектываў да ўзораў народнай песні, інструментальнай музыкі, харэаграфіі ў іх аўтэнтычным выглядзе; фарміраванне на гэтай аснове грамадскага фальклорнага руху. Дзейнасць міжнародных арганізацый (Міжнародны савет народнай музыкі пры ЮНЕСКА, Грамадства этнамузыкалогіі ў ЗША, Міжнародная арганізацыя па народнай творчасці ў Аўстрыі і інш.).



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел III. Этнамузыкалагічны практыкум

*Тэма 23. Асновы натацыі народных песень: Спецыфіка фальклорных выканальніцкіх прыёмаў і спосабы іх абазначэння*

Азнаямленне з простымі выканальніцкімі прыёмамі, вывучэнне спосабаў іх абазначэння (асваенне знакавай семантыкі). Пад'езды і спады. Глісанда. Гукі нявызначанай вышыні. Пэўныя і неазначальныя флажалеты. Завышэнне і прыніжэнне тону. Падыманне і апусканне тону. Фермата без кропкі і перавернутая фермата.

*Тэма 24. Асноўныя рытмічныя малюнкі народнай песні*

Бінарныя, трыёльныя, пункцірныя і сінкапіраваныя рытмічныя схемы. Шкала рытмічных пульсацый. Тыпы паўз.

*Тэма 25. Вызначэнне тэмпу ў народных песнях. Лад і танальнасць народнай песні*

Тэмп як адна з дынамічных характарыстык музычнай тканіны. Механічны і «жывы» тэмп. Тэмпавая ідэнтыфікацыя рытмічных цыклаў. Метраном Мельцэля. Паскарэнне і запавольванне песні. Лад і танальнасць народнай песні. Вызначэнне ладу і танальнасці. «Падыманне» песні як адлюстраванне эмацыянальнага тонусу.

*Тэма 26. Вызначэнне музычнай формы народнай песні*

Музычная страфа (куплет). Яе структура. Такт вышэйшага парадку. Метр і памер у фальклорнай музыцы. Тактаванне народнай песні.

*Тэма 27. Упрыгожванні ў народных песнях. Мелізмы*

Віды мелізмаў. Песні з багаццем мелізматыкі: методыка натавання.

*Тэма 28. Народнапесенны верш. Музычная страфа. Афармленне натацыі*

Музычная строфіка народнапесеннага верша. Дыялектныя асаблівасці народнапесеннага верша. Адлюстраванне дыялектнай фанетыкі ў падтэкстоўцы. Стандартная форма (фармат) натацыі. Пашпарт песні.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 29. Асновы літаратурнага аналізу народных песень: Народнапесенная паэзія. Чысты верш*

Адрозненне паэзіі ад прозы. Верш як паэтычная адзінка. Народнапесенны верш. Чысты верш. Музычная строфіка. Тыпы верша ў фальклоры і ў тэорыі літаратуры. Танічны верш. Сілабічны верш. Сілаба-танічны (стопны) верш і яго віды.

*Тэма 30. Тыпы фальклорнага верша. Сюжэт і кампазіцыя верша. Родавыя і жанравыя разнавіднасці народнапесеннага верша*

Роды і жанры народнапесеннага верша. Эпас. Эпічныя жанры. Лірыка. Лірычныя жанры. Ліра-эпічныя жанры фальклору. Жанравае дзяленне народных песень. Сюжэт і кампазіцыя верша. Асноўныя кампазіцыйныя прыёмы (апавяданне, апісанне, ступеньчатае звужэнне вобразаў і інш.). Сродкі мастацкай выразнасці фальклору. Алегорыя. Асноўныя сродкі выразнасці народнапесеннага верша: метафара, эпітэт, гіпербала, параўнанне, іронія. Сімволіка народнай песні.

*Тэма 31. Музычная страфа і куплет. Рытмаскладовая формула верша*

Музычная страфа і куплет. Куплетна-прыпеўная форма. Формула верша. Формула напеву. Суадносіны формулы верша з формулай напеву. Вызначэнне рытмаскладовай формулы верша. Прынцыпы і правілы, неабходныя для складання рытмаскладовай формулы верша.

*Тэма 32. Асаблівасці дыялекту народных песень*

Дзяленне мовы на прыслоўі і гаворкі. Гаворка і манера спеваў выканаўцы. Дыялектныя словы. Дыялектныя формы слоў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*

*1. Алексеев, Э. Е.* Нотная запись народной музыки: Теория и практика / Э. Е. Алексеев. – М. : Сов. композитор, 1990. – 168 с. : нот.

*2. Алексеев, Э. Е.* Раннефольклорное интонирование: Звуковысотный аспект / Э. Е. Алексеев. – М. : Сов. композитор, 1986. – 240 с.

*3. Асафьев, Б. В.* О народной музыке / Б. В. Асафьев ; сост.: И. И. Земцовский, А. Кунанбаева. – Л. : Музыка, 1987. – 248 с. : нот.

*4.* Белорусская этномузыкология: Очерки истории (XIX–XX вв.) / ред. З. Можейко. – Минск : Тэхналогія, 1997. – 254 с. : нот.

*5. Гиппиус, Е. В.* Избранные труды в контексте белорусской этномузыкологии / Е. В. Гиппиус ; ред.-сост. З. Можейко. – Минск : Тэхналогія, 2004. – 284 с.

*Дадатковая*

*1. Азадовский, М. К.* История русской фольклористики : в 2 т. / М. К. Азадовский. – М. : Учпедгиз, 1958. – Т. 1. – 479 с. ; 1963. – Т. 2. – 363 с.

*2.* Анализ вокальных произведений : учеб. пособие / под ред. О. Коловского. – Л. : Музыка, 1988. – 352 с. : нот.

*3. Асафьев, Б. В.* Музыкальная форма как процесс / Б. В. Асафьев. – 2-е изд. – М. : Музыка, 1971. – 376 с.

*4. Асафьев, Б. В.* Речевая интонация / Б. В. Асафьев ; под ред. Е. М. Орловой. – М. ; Л. : Музыка, 1965. – 136 с. : нот.

*5. Банин, А. А.* Слово и напев. Проблемы аналитической текстологии / А. А. Банин // Фольклор. Образ и поэтическое слово в контексте ; отв. ред. В. М. Гацак. – М. : Наука, 1984. – С. 170–202.

*6. Банин, А. А.* К изучению русского народнопесенного стиха. Методологические заметки / А. А. Банин // Фольклор. Поэтика и традиция ; отв. ред. В. М. Гацак. – М. : Наука, 1982. – С. 94–139.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*7. Банин, А. А.* Метод морфологического описания произведений фольклора / А. А. Банин // Методы изучения фольклора : сб. науч. тр. – Л. : ЛГИТМиК, 1983. – С. 80–95.

*8. Банин, А. А.* О принципах моделирования обобщенного слогоритма. Вопросы методики и методологии / А. А. Банин // Памяти К. В. Квитки : сб. ст. ; ред.-сост. А. Банин. – М. : Сов. композитор, 1983. – С. 165–179.

*9. Банин, А. А.* Об одном аналитическом методе музыкальной фольклористики / А. А. Банин // Музыкальная фольклористика ; ред.-сост. А. А. Банин. – М. : Сов. композитор, 1978. – Вып. 2. – С. 117–157.

*10. Богатырев, П. Г.* Вопросы теории народного искусства / П. Г. Богатырев. – М. : Искусство, 1971. – 544 с.

*11. Варфоломеева, Т. Б.* Северобелорусская свадьба. Обряд, песенно-мелодические типы / Т. Б. Варфоломеева. – Минск : Наука и техника, 1988. – 158 с. : нот.

*12.* Восточнославянский фольклор: словарь научной и народной терминологии / под ред. В. Е. Гусева, В. М. Гацак; отв. ред. К. П. Кабашников. – Минск : Навука і тэхніка, 1993. – 478 с.

*13. Гилярова, Н. Н.* К проблеме преподавания музыкального фольклора в вузе. Этномузыкальный аспект образования / Н. Н. Гилярова // Психология музыкальной деятельности : учеб. пособие. – М. : Academia, 2003. – С. 303–317.

*14. Гилярова, Н. Н.* К вопросу о методике комплексного изучения локальной традиции. Шацкий этнодиалектный словарь / Н. Н. Гилярова, И. А. Морозов, И. С. Слепцова // Этнографическое обозрение. – 1999. – № 1. – С. 41–66.

*15. Гилярова, Н. Н.* Идеи Е. Линевой и современные методы этномузыковедческого исследования / Н. Н. Гилярова // По следам Е. Э. Линевой : сб. науч. ст. – Вологда : Изд-во обл. науч.-метод. центра культуры и повышения квалификации, 2002. – С. 5–14.

*16. Гошовский, В. Л.* У истоков народной музыки славян: Очерки по музыкальному славяноведению / В. Л. Гошовский. – М. : Сов. композитор, 1971. – 304 с. : нот.

*17. Гусев, В. Е.* Эстетика фольклора / Е. В. Гусев. – Л . : Наука, 1967. – 318 с.

*18. Елатов, В. И.* Ладовые основы белорусской народной музыки / В. И. Елатов. – Минск : Наука и техника, 1964. – 216 с. : нот.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*19. Елатов, В. И.* Мелодические основы белорусской народной музыки / В. И. Елатов. – Минск : Наука и техника, 1970. – 143 с. : нот.

*21. Елатов, В. И.* Ритмические основы белорусской народной музыки / В. И. Елатов. – Минск : Наука и техника, 1966. – 220 с. : нот.

*21. Земцовский, И. И.* Мелодика календарных песен / И. И. Земцовский. – Л. : Музыка, 1975. – 224 с. : нот.

*22. Коргузалов, В. В.* Генетические предпосылки жанровой классификации музыкального фольклора / В. В. Коргузалов // Русский фольклор. – Л. : Наука, 1975. – Т. 15. – С. 240–273.

*23. Мазель, Л. А.* О системе музыкальных средств и некоторых принципах художественного воздействия музыки / Л. А. Мазель // Интонация и музыкальный образ : ст. и исслед. ; под общ. ред. Б. М. Ярустовского. – М. : Музыка, 1965. – С. 225–263.

*24. Михайлов, М.* Стиль в музыке / М. Михайлов. – Л. : Музыка, 1981. – 264 с.

*25. Можейко, З. Я.* Календарно-песенная культура Белоруссии: Опыт системно-типологического исследования / З. Я. Можейко. – Минск : Наука и техника, 1985. – 247 с. : нот.

*26. Мухаринская, Л.* К вопросу об эстетическом освоении действительности в современном белорусском народнопесенном творчестве. Исследование / Л. Мухаринская. – Л. : Сов. композитор, 1982. – 78 с. : нот.

*27. Мухаринская, Л.* Белорусская народная песня. Историческое развитие / Л. Мухаринская. – Минск : Наука и техника, 1977. – 216 с. : нот.

*28. Назіна, І. Д.* Беларускія народныя музычныя інструменты / І. Д. Назіна. – Мінск : Беларусь, 1997. – 239 с. : нот.

*29. Орлова, Е. М.* Интонационная теория Асафьева как учение о специфике музыкального мышления. История. Становление. Сущность / Е. М. Орлова. – М. : Музыка, 1984. – 302 с.

*30. Пашина, О. А.* Ареальный аспект соотношения функции и структуры музыкально-фольклорных текстов / О. А. Пашина // Славянские этюды: сб. к юбилею С. М. Толстой. – М. : Индрик, 1999. – С. 331–339.

*31. Пашина, О. А.* Календарно-песенный цикл у восточных славян / О. А. Пашина. – М. : Гос. ин-т искусствознания, 1998. – 292 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

32. *Путилов, Б. Н.* Методология сравнительно-исторического изучения фольклора / Б. Н. Путилов. – Л. : Наука, 1976. – 245 с.

33. *Рубцов, Ф. А.* Интонационные связи в песенном творчестве славянских народов: Опыт исследования / Ф. А. Рубцов. – Л. : Сов. композитор, 1962. – 116 с. : нот.

34. *Рубцов, Ф. А.* Статьи по музыкальному фольклору / Ф. А. Рубцов. – Л. ; М. : Сов. композитор, 1973. – 224 с. : нот.

35. *Руднева, А. В.* Русское народное музыкальное творчество: Очерки по теории фольклора / А. В. Руднева ; ред.-сост.: Н. Н. Гилярова, Л. Ф. Костюковец. – М. : Композитор, 1994. – 223 с. : нот.

36. *Савельева, Н. М.* О региональных и локальных разновидностях типовых русских песенных структур / Н. М. Савельева // Проблемы композиции народной песни. – М., 1997. – С. 41–47. – (Науч. тр. Моск. гос. консерватории; сб. 10).

37. Смоленский музыкально-этнографический сборник / отв. ред. О. А. Пашина. – М. : Индрик, 2003. – Т. 1: Календарные обряды и песни. – 760 с. : нот. ; Т. 2 : Похоронный обряд. Плачи и поминальные стихи. – 550 с. : нот.

38. *Тавлай, Г. В.* Белорусское Купалье: Обряд, песня / Г. В. Тавлай. – Минск : Наука и техника, 1986. – 174 с. : нот.

39. *Толстой, Н. И.* Язык и народная культура. Очерки по славянской мифологии и этнолингвистике / Н. И. Толстой. – 2-е изд., испр. ; сост. С. М. Толстая ; отв. ред. А. Ф. Журавлев. – М. : Индрик, 1995. – 512 с.

40. *Христиансен, Л. Л.* Ладовая интонационность русской народной песни: Исследование / Л. Л. Христиансен. – М. : Сов. композитор, 1976. – 390 с. : нот.

41. *Чекановска, А.* Музыкальная этнография: Методология и методика / А. Чекановска ; пер. с пол. Г. Д. Блейза. – М. : Сов. композитор, 1983. – 190 с. : нот.

42. *Щуров, В. М.* Стилевые основы народной музыки / В. М. Щуров ; Моск. гос. консерватория. – М., 1998. – 466 с. : нот.

43. *Щуров, В. М.* Южнорусская песенная традиция. Исследование ; В. М. Щуров. – М. : Сов. композитор, 1987. – 320 с. : нот.

44. *Эльшекова, А.* Об изучении ранних форм славянской народной музыки / А. Эльшекова // Славянский музыкальный фольклор: ст. и материалы. – М. : Музыка, 1972. – С. 114–125.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Пералік рэкамендуемых сродкаў дыягностыкі

Для дыягностыкі прафесійных кампетэнцый, выяўлення ўзроўню засваення ведаў і ўменняў па дысцыпліне рэкамендаваны наступны інструментарый:

– падрыхтоўка прэзентацый;

– падрыхтоўка пісьмовых кантрольных работ (заданняў);

– напісанне рэфератаў па асобных раздзелах дысцыпліны;

– напісанне дакладаў на навуковыя канферэнцыі па асобных тэмах дысцыпліны;

– вуснае апытанне студэнтаў на семінарах па распрацаваных тэмах.

## Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананні самастойнай работы студэнтаў

Выкананне самастойнай работы па дысцыпліне прадугледжана тэматычнымі планамі і абавязкова для кожнага студэнта.

Самастойная работа выконваецца ў любой рэкамендаванай форме па адной з тэм, якія прыведзены ніжэй. Яна павінна мець тытульны ліст, асноўную частку і спіс літаратуры.

Тэматыка самастойнай работы з'яўляецца абавязковай, але студэнт мае права звузіць ці пашырыць абраную тэму. Пры напісанні работы можна выкарыстоўваць літаратуру па курсе.

**Формы выканання самастойнай работы:**

– напісанне рэферата (не менш 12 старонак);

– распрацоўка візуальнай прэзентацыі (не менш 12 слайдаў);

– распрацоўка аўдыявізуальнай прэзентацыі (не карацей за 2 хвіліны дэманстрацыі);

– падрыхтоўка творчага нумара па тэме (сольнага ці дуэтам за 2 хвіліны дэманстрацыі).

**Прыкладныя тэмы для самастойнай работы:**

1. Дзеячы нацыянальных музычна-этнаграфічных школ Еўропы пачатку XX ст.
2. Даследчая і музычная дзейнасць Р. Шырмы.
3. Даследчая і музычная дзейнасць Г. Цітовіча.
4. Даследчая і педагагічная дзейнасць Л. Мухарынскай.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

5. Асноўныя кірункі этнамузыкалагічных даследаванняў у Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі.

6. Дзейнасць прадстаўнікоў беларускага этнаінструментазнаўства.

7. Дзейнасць даследчыкаў у галіне беларускай аўдыявізуальнай антрапалогіі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**ЭТНАМУЗЫКАЛОГІЯ**

*Вучэбная праграма*
*ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне*
*для спецыяльнасці 1-18 01 01 Народная творчасць*
*(па напрамках), напрамку спецыяльнасці*
*1-18 01 01-05 Народная творчасць (фальклор)*

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар Л. М. Мельнік

Падпісана ў друк 2015. Фармат 60х84 $^1/_{16}$.
Папера пісчая № 2. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 1,39. Ул.-выд. арк. 0,89. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ